Пролетары усіх краеў, злучайцеся!

Чырвоная зьмена

№ 143 (1412) | АЎТОРАК, 23 чэрвеня 1931 г.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

ФАШЫСТЫЯ ЗАБАРАНІЛІ ЧЫРВОНУЮ СПАРТАКІЯДУ

Соцыял-жандары „папярэджваюць“ пагрозу грамадзкай бясьпечнасьці

На выпад гржэзінскіх пролетарыят і працоўная моладзь адкажуць новай хваляй рэволюцыйнага ўздыму

Забарона соцыял-фашысцкім паліцэй-прэзыдэнтам Гржэзінскім міжнароднай спартакіяды чырвоных спортыўных організацый ў Бэрліне зьяўляецца чарговай спробай нямецкага фашызму і соцыял-фашызму перашкодзіць разьвіцьцю рэволюцыйнага руху.

Комуністычная газэта „Ротэ Фанэ“ і камітэт па скліканьню міжнароднай спартакіяды заклікае да масавых протэстаў і патрабаваньняў адмены забароны.

У адзнаку солідарнасьці з рэволюцыйнымі фізкультурнымі організацыямі, фізкультурнікі і комсамольскія організацыі Савецкага саюзу адкажуць масавымі протэстамі і хваляй абурэньня.

Комсамольскія фізкультурныя організацыі павінны разгарнуць масавую кампанію протэсту ў адказ на чарговы выпад фашызму супроць рэволюцыйных фізкультурных організацый.

Гржэзінскія ў спудзе перад сілай чырвоных спортсмэнаў

БЭРЛІН, 21.—Комуністычная газэта „Ротэ Фанэ“ 20-га красавіка апублікавала паведамленьне аб забароне паліцэйпрэзыдэнтам Гржэзінскім міжнароднай спартакіяды чырвоных спорт'організацый, якая была прызначана на 4-е—12-е ліпеня ў Бэрліне.

Гржэзінскі мотывуе забарону тым, што спортакіяда пагражае грамадзкай бясьпечнасьці. Аднак сутнасьць гэтай забароны зусім відавочна, каця, для прыкрыцьця не сапраўднага рэакцыйнага характару, забаронены і спортыўны сход нацыянал-соцыялістых, які скліканы на 20-ае ліпеня.

Гржэзінскія ў спудзе перад сілай, якую павінны продэманстраваць чырвоныя спортыўныя організацыі, і банкрутцвам уміраючых соцыял-дэмократычных організацый.

„Ротэ Фанэ“ заклікае наладзіць дэмонстрацыі масавага протэсту і патрабаваць адмены забароны спартакіяды.

Пад пацыфісцкі „шумок“ Зэвэрынгі будуюць броняносцы

БЭРЛІН, 21.—Па паведамленьню „Бэрлінэр Тагеблат“, прускі міністар унутраных спраў—соцыял-дэмократ Зэвэрынг—забараніў распаўсюджваньне лістоўкі нямецкага пацыфісцкага таварыства, якая накіравана супроць будаўніцтва броняносцаў. „Бэрлінэр Тагеблат“ выказвае сваё неўразуменьне з поваду гэтай забароны і заклікае міністэрства замежных спраў ужыць крокі для адмены гэтай забароны, шкоднае, па думцы газэты, па зьнешня-палітычных меркаваньнях.

Вулічныя бягі ў Бэрліне чырвоных спортсмэнаў на 20 кілёмэтраў у сувязі з падрыхтоўкай да міжнароднай спартакіяды.

Адозва міжнароднага камітэту па падрыхтоўцы спартакіяды

БЭРЛІН, 21.—У сувязі з забаронай Бэрлінскай рабочай спартакіяды, міжнародны камітэт па падрыхтоўцы спартакіяды выпусьціў адозву да працоўных усіх краін. Адозва заклікае працоўных ператварыць кампанію солідарнасьці са спартакіядай у магутны рух протэсту супроць забароны Бэрлінскай спартакіяды.

Узяць тэмпы, усе ў паход!

Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове па пытаньню аб папярэдніх выніках сяўбы і задачах уборачнай кампаніі прапанаваў: „ва ўсіх без выключэньня колгасах скончыць да пачатку уборкі падлік працадзён, якія выпрацаваны кожным колгасьнікам за час насеўнай і прапохачнай кампаній“.

Каб ператварыць гэта рашэньне партыі на мову канкрэтных спраў, комсамол Беларусі з 25-га чэрвеня па 10-е ліпеня абвясьціў комсамольскі паход за правільны ўлік працы і правільны запіс працадзён у працоўную кніжку кожнага колгасьніка. Для практычнага правядзеньня гэтай работы ЦК абавязаў райкомы і гаркомы мобілізаваць 15 тысяч лепшых комсамольцаў.

Пачынаючы з 19-га чэрвеня, „Чырвоная зьмена“ і ўвесь комсамол Беларусі разгарнулі масавую работу па падрыхтоўцы да выхаду ў паход. Ужо рад раёнаў правёў падрыхтоўчую работу. Полацкі раён мобілізаваў 94 комсамольцы, якія 24-га чэрвеня выходзяць у колгасы. Дрысенскі—40 чал. Аршанскі і іншыя раёны па-ўдарнаму праводзяць мобілізацыю.

Комсамол Беларусі ўзяў на сябе абавязак давесьці да кожнага колгасьніка працоўную кніжку, наладзіць дакладны ўлік норм выпрацоўкі кожным колгасьнікам паасобку, па колькасьці і якасьці працы.

Комсамольскае кіраўніцтва павінна мобілізаваць усе сілы комсамолу, працоўнай моладзі, шырокія колы колгасьнікаў і колгасьніц, прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ўсю культурную сілу вёскі, аграномаў, настаўнікаў, хатнікаў.

Профсаюзы, кооперацыйныя організацыі, сельсаветы і іншыя грамадзкія організацыі павінны актыўна ўключыцца ў паход за організацыю ўліку ў колгасах, за ўмацаваньне колгасаў, супроць „ураўнілаўкі“, скажэньня дырэктыў партыі па пытаньнях організацыі працы ў колгасах.

„Зьдзельшчыну нельга ажыцьцявіць без своечасовага ўліку колькасьці выпрацаваных кожным колгасьнікам працадзён. Больш таго,—бяз уліку немагчыма існаваньне колгасу, як буйнай гаспадаркі“.

Так акрэсьліў політычны зьмест правільнай пастаноўкі ўліку ў колгасах чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б).

Ц. О. нашай партыі—„Правда“—абвясьціла з 25-га па 30-е „пяцідзёньнік уліку працы ў колгасах“. Уключаючыся ў правядзеньне гэтага пяцідзёньніка, які супадае з паходам беларускага комсамолу за улік працы ў колгасах, мы заклікаем увесь раённы друк стаць на чале організацыі шырокіх мас колгасьнікаў і усёй грамадзкасьці вёскі на выкананьне тых задач, якія пастаўлены перад пяцідзёньнікам.

Комсамол да 23-га павінен скончыць мобілізацыю 15 тысяч. 23-га і 24-га праводзяцца раённыя нарады для інструктаваньня мобілізаваных. 25-га па ўсіх колгасах БССР павінна ўдарнымі тэмпамі распачацца работа комсамольцаў па ўліку працы.

Гураганным агнём біць па кулаку і яго агентах розных колераў, якія імкнуцца сарваць правільную організацыю працы ў колгасах. Пасьпяховае скончэньне работы па наладжваньню колькаснага і якаснага ўліку выпрацоўкі кожнага колгасьніка—зарука бальшавіцкіх перамог ва ўборачнай кампаніі.

Два дні рашаюць!

Менск адстае ў рэалізацыі пазыкі

Менскі комсамол не адказаў на выклік Гомеля, не надаў патрэбных тэмпаў у рэалізацыі пазыкі і выкананьні соцдагавору з Украінай

Кінуць усе сілы на поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў

Праз два дні канчаецца ўдарны дзясьцідзёньнік па рэалізацыі пазыкі 3-га рашаючага.

Побач з вялікай хваляй актыўнасьці і ініцыятывы працоўных мас па рэалізацыі падпіскі па раду раёнаў гэта работа пастаўлена зусім нездавальняюча. Рад гарадоў і асобных прадпрыемстваў яшчэ далёка ня выканалі свае заданьні па рэалізацыі падпіскі.

Комсамольская організацыя павінна рашуча пераключыцца на поўнае выкананьне плянаў рэалізацыі падпіскі. Менская комсамолія павінна адказаць на выклік Гомельскага комсамолу і забясьпечыць выкананьне плянаў падпіскі.

3-ці рашаючы год пацігодкі, соцдагавор з Украінай абавязуюць мобілізаваць усе сілы на тое, каб пляны рэалізацыі пазыкі былі поўнасьцю выкананы.

Пазыка трэцяга рашаючага ў цэхах

Пры вялізарным энтузіязьме мас

ГОМЕЛЬ.—Падпіска на пазыку „3-ці рашаючы“ разгортваецца па горадзе пры вялізарнейшым энтузіязьме мас. Амаль усюды рабочыя падпісваюцца на месячны заработак. За першыя тры дні падпіскі на асноўных прадпрыемствах Гомеля высунуты сустрэчныя пляны. Завод Сельмаш за гэтыя дні выканаў заданьне на 32 проц. майстэрні Жылсаюзу—на 78 проц.

ГСПС вылучыў дзьве вопытна-паказальныя пабудовы і прапанаваў профсаюзным і шэфскім організацыям заразжа разгарнуць работу ў падшэфных вёсках.

Вялікую работу праводзіць заводзкі друк. Члены рэдколегіі „Голасу краўца“, надпісаўшыся на пазыку на месячны заработак, выклікая ўсе рэдколегіі шматтыражак. Газэта „Цягнік соцыялізму“ выпускаліштодзённы бюлетэнь ходу рэалізацыі пазыкі. „Палеская Праўда“ штодня выпускае ілюстраваную насьценную газэту, якая вывешваецца ў цэнтры гораду.

Будзе рэалізавана ў найкарацейшы тэрмін

Студэнты вясновага прыёму Беларускага Дзяржаўнага Зоотэхнічнага інстытуту, 5-й групы факультэту сьвінагадоўлі, падпісаліся на пазыку 3-га рашаючага звыш 100 проц. месячнай стыпэндыі.

Узялі абавязацельства прымаць актыўны ўдзел у распаўсюджваньні пазыкі ў падшэфным сельсавеце.

Студэнты запэўніваюць, што пазыка будзе рэалізавана ў самы кароткі тэрмін.

Каранкевіч.

Працаўнікі ашчадкас паказваюць прыклад

Курсы ашчадработнікаў пры Наркомфіне, у колькасьці 200 чал., падпісаліся на пазыку „3-га рашаючага“ на суму 10.800 руб. і выклікаюць насьледваць свайму прыкладу фінансава-бюджэтныя курсы пры Наркомфіне.

Каплан, Карзун

А. ПРОКА

Аб кангрэсе брунінг-соцыялістых

Лісты з Лейпцыгу

ЛІСТ 3-ці

Дзьве гадзіны гаварыў Оленгаўэр. Ён ня мог прайсьці міма пытаньня аб становішчы моладзі, бо „у Нямеччыне зараз 7 мільёнаў працоўнае моладзі“, і „у кожным перыодзе выбараў упяршыню ў выбарах прымае ўдзел 5 мільёнаў моладзі“. І яшчэ павінен быў прызнаць Оленгаўэр, што „моладзь зараз сільна політызавана“ і што „большая частка моладзі галасавала не за соцдэмаў, але за комуністых“!

Вось гэты момант стаінь каменем у горле соцыял-фашызму. Яны згодны былі-б ліквідаваць наогул політычныя організацыі для моладзі, але гэта прывяло-б моладзь яшчэ хутчэй да комунізму. Оленгаўэр павінен прызнаць што *„моладзь бунтуе супроць дэмократыі і рэспублікі, што моладзь бунтуе супроць усяго“!*

Гэта адчайвае беднага Оленгаўэра—і не здарма. Моладзь ня бунтуе „супроць усяго“ бяз мэты, яна бунтуе супроць усяго таго, што яна бачыць у капіталістычным грамадзтве!

Оленгаўэр палічыў за лепшае змоўчаць аб тым, супроць чаго моладзь бунтуе.

Інакш ён павінен быў-бы намаляваць жудасную карціну эксплёатацыі, беспрацоўя, галаду, жабрацтва, проституцыі сярод маладога пакаленьня рабочае клясы Нямеччыны.

Ён мог толькі сказаць, што „моладзь ня можа на аснове марксысцкай тэорыі зразумець практычную дзейнасьць с.-д. партыі“.

Але гэтага ня могуць зразумець ня толькі маладыя пролетары, але і ўсе рабочыя. „Падвойная бухгальтэрыя соцыял-фашыстых, разыходжаньне між тэорыяй і практыкай незразумела пролетарыям, і таму Оленгаўэр часткова мае рацыю, калі сьцьвярджае, што „марксызм вымушае моладзь бунтаваць супроць с.-д. партыі“.

Толькі часткова мае рацыю, бо моладзь ня толькі бунтуе супроць соцыял-фашыстых, але і пераходзіць у лягер комуністых. Оленгаўэр сам абвясьціў: „Мы можам колькі хочам сьцьвярджаць, што савецкія абставіны ня могуць быць годны для Нямеччыны“.

Моладзь верыць у бальшавізм

Комуністыя зьвяртаюцца да моладзі на зразумелай ёй мове, у зразумелых ёй формах. Ужо 70 год, як мы гэтую мову больш ня ўжываем і ня можам не ў сучасных політычных абставінах ужываць“.

Калі соцыял-фашысцкі профэсар Нэльтынг запатрабаваў заб раніць „Аб'яднаньне млядо-соцыялістых“, дзеля таго, што яны „ортодоксальна“ тупыя *) і конгрэс парашыў ліквідаваць гэта „аб'яднаньне“, дык гэтым яшчэ ня быў паказаны выхад для рабочае моладзі, якая яшчэ зараз знаходзіцца ў радох „С. А. Ю“. Конгрэс у сваёй рэзолюцыі ніякага выхаду з сучаснай патрэбы рабочае моладзі ня мог паказаць і гэтым ён толькі дапамог большай частцы сваёй моладзі хутчэй пазнаць існасьць соцыял-фашызму.

Конгрэс крызісу соцыял-фашызму—конгрэс банкруцтва перад фашызмам *паказаў таксама, што ён* конгрэс супроць рабочай моладзі, конгрэс супроць соцыялізму!

Тысячы членаў „С. А. Ю.“, якія да гэтага часу толькі бунтавалі, пачынаюць цяпер актыўна змагацца супроць здрадніцтва соцыял-фашызму. Яны бачуць, што гэта немагчыма ў радох соцыял-фашызму—і пераходзяць цяпер да комунізму, у комсамол.

„Ліквіданыя „С. А. Ю.“, як масавай організацыі рабочае моладзі Нямеччыны“, стаіць зараз у цэнтры ўвагі комсамолу.

А. Прока.

Лейпцыг, чэрвень 1931 году

*) Профэсар Нэльтынг зрабіў „новую“ рэвізію Маркса: „Ідэолёгіі, якія Маркс устанавіў, былі годны для часу монархіі і капіталізму—вольнай конкурэнцыі. Мы павінны стварыць новую ідэолёгію і новую тэорыю для пэрыоду дэмократыі і монополістычнага капіталізму. Хто тупы, Нэльтынг, ці „млядо-соцыялістыя“, здагадацца ня цяжка!

Да другога пленуму ЦК ЛКСМБ

ЛКСМБ У АДКАЗЕ ЗА ПРАСТОЙ ЧАТЫРОХ

Торпазаводы „Вялікі Мох“, „Вольніца, „Рэмізава“ і „Смалявічы“ яшчэ не ўвайшлі ў строй штурмуючых заводаў

Прыцягнуць да адказнасьці тых, хто ігноруе важнейшыя рашэньні партыі і ўраду

Дабіцца пералому ў выкананьні прамфінпляну

На працягу ўсяго торпсэзону завод „Чырвоны Сьцяг“ (Смалявічы) плянецца ў хвасьце. Толькі на 67 проц. выконваецца каляндарны плян, а сэзонны—на 3 проц.

Брыгада комсамольцаў ВСНГБ, пасланая на падшэфны ячэйцы завод выявіла карэньні гэтага прарыву. Тут вінаваты ў першую чаргу Белторп, адміністрацыя і кооперацыя заводу, а таксама профсаюзныя і комсамольскія організацыі.

Было так, што рабочыя доўгі час ня ведалі норм выпрацоўкі, з імі не складаліся брыгадныя дагаворы, соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам рабочыя ня былі ахоплены. На завод пасылаюць непатрэбнае абсталяваньне, як часткі малога гідраторпу трактароў, а неабходных для машына-фармовачных агрэгатаў блёкаў і лёкамабіляй не даюць. Машыны, якія ёсьць на заводзе, няспраўныя.

Праца кооперацыі заслугоўвае ўвагі адпаведных органаў. Служачыя атрымоўваюць аднолькавыя пайкі, як тарпянікі. А галоўны бухгальтар нават ухітрыўся атрымліваць падвойныя. Бываюць выпадкі, калі для значнай часткі рабочых не хапае абедаў, а часам застаюцца лішнія. У сталоўцы брудна і антысанітарна.

Культмасавая праца на заводзе пастаўлена вельмі дрэнна. Комсамольская ячэйка ў гэтых адносінах не праявіла ніякай ініцыятывы. За апошнія паўтара-два месяцы ня было ніводнага сходу ячэйкі і бюро. Нярэдкі выпадкі п'янства сярод паасобных комсамольцаў.

Сьмілавіцкі РК ЛКСМБ зусім пакінуў гэты вучастак працы бяз увагі і кіраўніцтва. Мобілізацыя 20 комсамольцаў на торпзавод таксама ня выканана.

Зараз на заводзе працуюць прысланы з Менску 60 рабочых. Прыехала оргпартгрупа ЦК КП(б)Б. Ячэйка ВСНГБ узяла шэфства над торпзаводам. Усё гэта дало некаторы пералом, але ён яшчэ недастаткова адчуваецца на выкананьні прамфінпляну.

Белторп павінен забясьпечыць завод неабходным абсталяваньнем і рабочай сілай, каб дабіцца пералому ў выкананьні прамфінпляну, а г. зн.—забясьпечыць менскую электростанцыю неабходным апалам.

Брыгада „Ч. З.“ Энцін і Сандлер.

„Чырвоны тарпянік“—у глыбі прарыву

Комсамолія не дала яшчэ неабходных заводу кадраў

Плян здабычы торпу за сэзон завод „Чырвоны тарпянік“ выканаў на 16-VI—на 24,3 проц. Месячнае заданьне—на 68,7 проц.

Прычыны такога ганебнага прарыву: невыкарыстаньне ўсіх магчымасьцяй выкананьня плянаў на самім заводзе, адсутнасьць належнай мобілізацыі рабочых мас, зусім слабая ўвага і дапамога торпзаводу з боку організацыі, галоўным чынам самога Віцебскага раёну.

Мэтоды социялістычных адносін да працы, спаборніцтва і ўдарніцтва не пастаўлены на вышыню змаганьня за торп. Аб гэтым сьведчаць і прыклады самой работы. Кожная машына (а іх дзьве) павінна даваць 30 тысяч цаглін за працоўны дзень. 17-га чэрвеня адна машына дала 28.200 цаглін, а другая—12 тысяч.

Такая разьбежка ў рабоце паміж машынамі ясна гаворыць аб якасьці работы і аб становішчы соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

Культурнае абслугоўваньне рабочых пастаўлена з рук вон кепска. Штодзённай культмасавай работы не вядзецца зусім. Газэт няма. Затое—кардёжная гульня, п'янка, факты шовінізму, антысэмітызму, усё тое, што на руку клясаваму ворагу, які стараецца сарваць тарпяныя пляны.

На торпзаводзе не хапае рабочай сілы, галоўным чынам, тарпяніц, якіх патрэбна яшчэ 200 чал. Аднак, прымацаваныя да заводу організацыі ганебна ня выконваюць дырэктыў партыі і ўраду аб забясьпечаньні яго рабочай сілай.

Па Бешанковіцкім раёне поўны зрыў вярбоўкі рабочай сілы. Ня лепш справа і з мобілізацыяй комсамольцаў на тарпяны фронт. Разьвёрстка ЦК ЛКСМБ ня выконваецца. Гарадоцкі РК ЛКСМБ павінен быў мобілізаваць не пазьней 1-га мая 3 чал. Сураскі—12, Лёзьненскі—8. Ня гледзячы, аднак на шматразовыя папярэджаньні ЦК ЛКСМБ, гэтыя райкомы не далі яшчэ ніводнага чалавека.

Віцебскі гарком ЛКСМБ выканаў разьвёрстку ЦК, даўшы на торпапрацоўкі 15 чал. Але-ж сустрэчную лічбу ў 30 чал. якую ён сам вызначыў ня выканаў. 3 пасланых, па вестках Гаркому, 28 чалавек на заводзе засталося ўсяго 15. Рэшта ўцякла. 3 комсамольскага колектыву фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі“ паслана пяць чалавек, а засталося два. Комсамольскія організацыі скурзаводу, акулярнай фабрыкі, інструментальнай ня выканалі разьвёрсткі. Віцебскі гарком КП(б)Б толькі паабяцаў даць торпзаводу 15 чалавек. Прадстаўнікі раёну „рэдкія госьці“ на заводзе, хаця тут і трывожнае становішча.

18-га чэрвеня бюро Віцебскага гаркому ЛКСМБ на сваім пасяджаньні пастанавіла ўзяць торпзавод пад асобы нагляд гаркому, дамобілізаваць комсамольцаў, прапанаваць ячэйцы кіно-установу і ТРАМ'у наладзіць культурнае абслугоўваньне заводаў. Рэальныя вынікі будуць тады, калі гарком дабʼецца неадкладнага ажыцьцяўленьня свае пастановы.



Тарпяніцы торпзаводу Міхановічы

Дэзэртыраў з тарпянага фронту трэба выгнаць з комсамолу. Райкомы, якія ня выканалі разьвёрстку, павінны атрымаць па заслугах.

М.

ЗРУХ ЁСЬЦЬ,—ДАБІЦЦА КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ!

У цэнтр увагі—цэх, брыгаду, групу, забясьпечыць баявую падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак!

(На ўсебеларускай нарадзе чыгуначнікаў)

Учора скончыла сваю працу усебеларуская нарада комсамольцаў чыгуначнікаў.


На нарадзе прысутнічала 40 дэлегатаў: ад Менску, Віцебску, Гомеля, Воршы, Жлобіна, Асіпавіч, Магілева і інш.

Нарада заслухала даклад намесьніка упаўнаважонага тав. Эгге „аб выніках выкананьня адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб чыгуначным транспарце і задачах комсамолу ў падрыхтоўцы правядзеньня асеньня-зімовых перавозак“ і даклад тав. Юркенева „аб задачах і выніках перабудовы комсамольскай работы на чыгунцы“.

Асеньня-зімовыя перавозкі сустрэць падрыхтаванымі

Тав. Эгге у сваім дакладзе зазначыў:

— Чыгуначны транспарт за гады існаваньня савецкае ўлады гіганцкімі крокамі ушоў уперад. Гэта яскрава сьцьвярджае і апошняя пастанова пленуму ЦК УсеКП(б).



Але-ж ня гледзячы на нашыя дасягненьні, транспарт зьяўляецца яшчэ адным з самых вузкіх месц народнае гаспадаркі.

ЦК УсеКП(б) і СНК СССР мобілізавалі ўвагу усёе грамадзкасьці на ліквідацыю прарыву у чыгуначным транспарце.

Аднак, яшчэ і зараз мы ня бачым рашучага пералому на чыгунцы. Гэта тлумачыцца тым, што наша работа па рэалізацыі важнейшых дырэктыў пастаўлена надзвычайна дрэнна. Мы бачым, як слаба на нізе выяўлена энтузіязму, вытворчай ініцыятывы рабочых мас, якую выклікала адозва ЦК.

Зараз чыгуначны транспарт стаіць перад сур'ёзнай капітальнай работай па падрыхтаваньні да асеньніх і зімовых перавозак, якія сёлета будуць значна павялічаны у параўнаньні з мінулымі гадамі, асабліва ў 4-м квартале.

Асноўным паказчыкам сёньняшняй работы аб тым, што мы яшчэ недастаткова разгарнулі падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак. Так, сярэдні працэнт пасажырскіх паравозаў за чэрвень месяц складае па тупых паказчыкам: Жлобін—97 проц., Гомель—95 проц., Віцебск—92 проц. і толькі Ворша перавысіла заданьне на 7 проц. Прабег таварных паравозаў дае прыблізна такія-ж лічбы.

Яшчэ да гэтага часу вельмі высокі процант хворых паравозаў. Так, у Жлобіне, замест заданьня ў 19,4 проц., процант хворых паравозаў складае 24,45 проц.—ня лепш і на іншых вузлох.

У справе грузаработы мы маем выкананьне: у Віцебску—129,7 проц., у Гомелі—115,23 проц., у Жлобіне—86,9 проц.

Усе гэтыя лічбы яскрава гавораць аб тым, што мы яшчэ не перабудавалі сваю работу ў адпаведнасьці з рашэньнямі ЦК партыі. Амаль па ўсіх раёнах работа перабудавана толькі фармальна. Нізавыя зьвеньні працуюць надзвычайна дрэнна, а вышэйшыя органы ім не дапамагаюць наладзіць працу.

Пытаньне спаранай язды зьяўляецца для нас адным з важнейшых, але да гэтага часу яно яшчэ знаходзіцца на [illegible].

У справе аздараўленьня чыгункі мы ўжо маем некаторыя зрухі, аднак, ён не дае рашучага пералому ў чыгуначным транспарце. Перад чыгункай зараз стаіць важнейшая задача: асеньня-зімовыя перавозкі. Гэта магчыма толькі тады, калі нашы партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі перабудуюць сваю работу на справе, калі яны, зрабіўшы цэнтрам увагі чыгункі групу, здолеюць стаць на чале энтузіязму шырокіх рабочых мас, з якім рабочая кляса ідзе па шляху выкананьня заданьня 3-га рашаючага году ў нашым соцыялістычным будаўніцтве.

Завяршыць перабудову комсамольскай работы

Выступіўшы з дакладам т. Юркенен гаварыў:

— У адказ на адозву ЦК УсеКП(б) і СНК, ЛКСМБ праявіў вялікую ініцыятыву ў ліквідацыі прарыву на чыгунцы. Аб гэтым сьведчыць у шэрагу артыкулаў у газэце „Чырвоная Зьмена“.

На падставе рашэньняў усесаюзнай нарады комсамольцаў чыгуначнікаў і рашэньняў ЦК УсеЛКСМ, наша комсамольская організацыя ўзялася за перабудову ўсёй сыстэмы і структуры комсамольскай работы на чыгунцы, каб забясьпечыць мобілізацыю ўсіх комсамольцаў і рабочай моладзі на ліквідацыю прарыву на ўсіх вучастках чыгункі.

Аднак, перабудова нашай работы ў большасьці сваёй праводзілася формальна. Мы ліквідавалі станцыйныя камітэты і стварылі комсамольскія колектывы па асобных гаспадарках: цягі, шляху, дэпо і інш., стварылі цэхавыя ячэйкі ў колектывах, але да канца сваёй працы не давялі, не перанесьлі цэнтру цяжару сваёй працы у нізавыя зьвеньні.

Мы рэзка адстаем у пытаньнях павароту комсамольскіх організацый тварам да транспорту. IX-ты зьезд сказаў, што комсамол у асобным павярнуўся тварам да гаспадарчых задач. Але комсамол чыгункі ў гэтых адносінах адстае нават і на сёньнешні дзень. Адсюль вывад, што ў далейшай працы па перабудове комсамольскіх ячэек мы павінны накіраваць усю ўвагу непасрэдна ў брыгаду-групу і цэх. Комсамолец-ударнік павінен заняць вядучую ролю ў цэху.

У нас ёсьць і добрыя прыклады ў рабоце. Мы маем такія зьявы як організацыя новых маладзёжных брыгад, варштатаў, якія даюць добрыя паказчыкі.

У Віцебскім раёне 11 ударных брыгад, у Гомелі 3 комсамольскія паравозы, дзьве комсамольскія комуны. Аднак, на такіх станцыях, як Асіповічы, Магілёў, Барысаў, Полацак і іншыя, якія ў БССР зьяўляюцца рашаючымі, работа не перабудавана. Кіраўніцтва гэтых організацый не мобілізавала комсамолію на рэалізацыю адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР.

Соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам комсамольская організацыя на чыгунцы ахоплена ў сярэднім 75,80 проц. Але тут ёсьць частка ілжэ-ўдарнікаў. Такім чынам ,мы ня выканалі рашэньняў ЦК УсеЛКСМ аб 100 процантным ахопе к-цаў ўдарніцтвам і соцспаборніцтвам. Гэта задача стаіць перад намі, як адна з асноўных на бліжэйшы час.

Да гэтага часу на чыгунцы амаль нічога ня зроблена па аўладаньню тэхнікай. Неабходна зараз-жа раагарнуць шырокую сетку гурткоў, тэхнічных брыгад па вывучэньню процэсаў сваіх варштатаў, цэхаў, паравозаў і ўсёй чыгункі. Вывучэньне і скарыстаньне замежнай тэхнікі—галоўнейшая задача дня.

Трэба зараз-жа паставіць пытаньне аб стварэньні комсамольскага кантролю, асабліва ў час асеньня-зімовых перавозак, над рацыянальным скарыстаньнем паравозаў і вагонаў, замацаваць спараную язду. Трэба памятаць, што пасьпяховае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак зьявіцца экзаменам для комсамолу чыгункі.

Зараз асноўны цяжар работы падае на перабудову і рэконструкцыю чыгункі. Пасьпяховае правядзеньне не будзе залежаць ад таго, на колькі мы хутка і правільна перабудуем комсамольскую работу. Тут вялікую дапамогу павінны аказаць раённыя камітэты і партыйныя організацыі шляхам жывога кіраўніцтва і перадачы добрага вопыту.

Вышэй тэмпы здабычы!



Ячэйка па... абежнікам

Торпазавод „1-е мая“ за апошнія тры дні выконвае свой дзённы плян у сярэднім на 60-62 проц.

Канчатковы пераход адбудзецца ў залежнасьці ад забесьпячэньня заводу рабочай сілай. Але комсамольская організацыя яшчэ ня выканала дадзеную ЦК ЛКСМБ разьвёрстку на мобілізацыі комсамольцаў на торпзаводы. Чашніцкі ЦК ЛКСМБ павінен быў наслаць 25 чал, а пакуль-што паслаў толькі 7.

15-га чэрвеня адбылося тэрміновае паседжаньне ЦК ЛКСМБ. Прыняты рашучыя захады да тых, хто зрывае выкананьне дадзенай разьвёрсткі.

РК ЛКСМБ да гэтага часу лічыць, што на заводзе ёсьць ячэйка і пасылае туды абежнікі; але ў сапраўднасьці там толькі некалькі зусім не організаваных комсамольцаў, сярод якіх ніякай працы не праводзіцца.

Усё гэта ня спрые пасьпяховаму выкананьню плянаў торпаздабычы. Раённы камітэт комсамолу павінен даць на завод неабходныя кадры і палепшыць становішча культмасавай працы.

Г. Палей.

25-га — першы дзень комсамольскага паходу за правільны ўлік ў колгасах

ВУЧЭЦЕСЯ Ў ПОЛАЦКУ І ДРЫСЫ — опэрацыйнасьці баявых тэмпаў!

Уключыць у комсамольскі паход усю пралетарскую грамадзкасьць

Посьпех у правядзеньні абвешчанага ЦК ЛКСМБ комсамольскага паходу за правільны ўлік працы ў колгасах будзе залежыць ад таго, наколькі раённыя комсамольскія організацыі па-баявому, па-опэрацыйнаму перабудуюцца для таго, каб узяць шпаркія тэмпы.

Полацкая і Дрысенская комсамолія першымі паказалі такія тэмпы опэрацыйнасьці ў выкананьні гэтага найважнейшага політычнага мерапрыемства.

25 чэрвеня — першы дзень паходу. Райкомы, ячэйкі, сьледуйце прыкладу Полацку і Дрысы! Не чакаючы ні хвіліны стройце баявыя калёны комсамольцаў у паход.

Чакаем зводак, рапартоў з баявых позыцый!

Полацак уключыўся — мобілізавана 97 чалавек

Цэнтральнаму штабу па кіраўніцтву паходам

ПОЛАЦАК, 22 (па тэлеграфу). — Полацкая комсамольская організацыя ўключылася ў абвешчаны ЦК ЛКСМБ комсамольскі „паход за правільны ўлік працы ў колгасах“.

Створан раённы штаб. Мобілізавана 97 комсамольцаў. 24-га мобілізаваныя выедуць у колгасы для практычнай работы.

Сэкратар Полацкага райкому ЛКСМБ Хазан.

Стат.—спрыят А-о.
ПРЫЁМ — 21 20 ч. — пар. № 179 — Ад. — пров. № — Прыняў Кова
ПЕРАДАЧА — га. г. м. пар. № — У — пров. № — Перадаў:
Полоцка № 41-24-21-16-20
Адрас: Менск газета „Чырвона[я] Змена“
Службовыя заметкі
уключылаось у паход со[з]дан штаб. Мобилизовано 97 комсомольцау 24 га выезжають у калгасы
Секратар полоцкага райкому Хазан

Мобілізавана 40 комсамольцаў

Нарада распачала работу

ДРЫСА, 23. (Па тэлеграфу). Дрысенскі раён уключыўся ў паход за правільны ўлік працы ў колгасах. Мобілізавана 40 комсамольцаў. Распачала сваю работу нарада па інструктаваньню мобілізаваных.

Сэкратар Дрысанскага РК ЛКСМБ Якубовіч.

Штодзённы ўлік зьдзельшчыны — ключ да ўдарных тэмпаў

Колгас „Новы Шлях“ Уноўскага сельсавету (Лёзьненскі раён) 4-га чэрвеня г. г. скончыў сяўбу, выканаўшы і перавыканаўшы пляны. Да пачатку сяўбы колгасьнікі організавалі брыгады і поўнасьцю перайшлі на зьдзельшчыну. Праца ў час сяўбы праводзілася па-ўдарнаму. Усе колгасьнікі былі ахоплены соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Плян па паасобных культурах значна перавыкананы. Лёну патрэбна было засеяць 55 га, засеяна — 61 га. Ячменю, замест 10, — засеяна 16 га; аўса замест 42 га, засеяна 50. Сілосных культур засеяна 4 га.

Толькі дзякуючы правільнаму правядзеньню зьдзельшчыны і штодзённага ўліку ў працаднёх, „Новы Шлях“ змог дабіцца такіх дасягненьняў, паказаўшы гэтым аднаасобнаму сэктару перавагу колгаснай гаспадаркі.

У самы разгар сяўбы організавалася ячэйка ЛКСМБ, у якую ўвайшлі 16 маладых колгасьнікаў. Пасьля організацыі ячэйкі праца ў колгасе пайшла яшчэ больш ударна. Назаўтра-ж, ня гледзячы на выхадны дзень, комсамольцы і беспартыйная моладзь а 12 гадзіне ночы выехалі працаваць на поле. За імі пасьледвалі і дарослыя колгасьнікі.

Колгас вырас з 10-ці гаспадарак у канцы 1930 г. да 70 гаспадарак.

„Новы Шлях“ узяў на грамадзкі буксір суседні колгас „Бязбожнік“, які зусім адстаў быў у сяўбе. Паслалі самую лепшую брыгаду з 10 колгасьнікаў, з сваімі коньмі, інвэнтарам і брыгадзірам. За чатыры дні дапамаглі „Бязбожніку“ ліквідаваць прарыў.

Зараз пачалася па-ўдарнаму падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі. Складаюцца працоўныя пляны.

Белахвосьцікаў Алесь

ПРЫВЯДЗЕЦЕ КУЛЬТАРМІЮ У БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ

Перад ёй вялізарная задача: па-ўдарнаму разгарнуць культабслугоўваньне ўборачнай кампаніі

Вялізарнейшае значаньне будзе мець культурна-бытавое абслугоўваньне ўборачнай кампаніі.

Політычны стрыжань усіх мерапрыемстваў па культурна-бытавому абслугоўваньню ўборачнай кампаніі — гэта 100 проц. збор ураджаю, ліквідацыя прастояў і прагулаў, барацьба за выкананьне норм выпрацоўкі, за максымальнае ўшчыльненьне рабочага дня колгасьніка, за новыя сапраўды соцыялістычныя тэмпы і мэтоды работы, за рацыянальную організацыю працы ў часе ўборкі.

Комсамольскія ячэйкі, культурная армія павінны неадкладна распачаць баявую падрыхтоўку да культурнага абслугоўваньня ўборкі.

Трэба неадкладна мобілізаваць на фронт уборкі і колектывізацыі ўдарныя атрады культурнай арміі.

Выйшлі на баявыя позыцыі

Вялікую работу прарабілі асьветнікі Чэрвеньскага раёну ў барацьбе на фронце колектывізацыі і другой бальшавіцкай вясны.

У час раённай конфэрэнцыі, якая адбывалася з 10 па 18 чэрвеня, асьветнікі Чэрвеньшчыны абвясьцілі сябе мобілізаванымі на фронт колектывізацыі на працягу 3-х дзён.

Паход быў зроблены ў больш адсталыя сельсаветы, у якіх процант колектывізацыі дасягнуў 5-7 проц.

150 удзельнікаў райконфэрэнцыі былі разьбіты на брыгады з такім разьлікам, каб перадавыя сельсаветы ўзялі на буксір адстаючых.

За гэтыя тры дні сіламі асьветнікаў было організавана 5 колгасаў і ўцягнута ў старыя колгасы 143 гаспадаркі.

Пры падагуленьні вынікаў гадовай работы выявілася, што асьветнікі Чэрвеньшчыны выканалі з гонарам пастанову 3-га ўсебеларускага настаўніцкага зьезду аб тым, каб адзін асьветнік уцягнуў 7 чал. у колгас.

Міх. Ракіта.

Мы дэманструем перад комсамоліяй і ўсёй пролетарскай грамадзкасьцю тых, хто опортуністычна недаацэньвае важнасьці культмасавай работы.

Чорная дошка

„Ціш ды гладзь“..

У колгасе „Сталёвы конь“ (Любаньскі раён) культурная работа адсутнічае. Колгас ня мае бібліотэкі. На ўвесь колгас ідзе толькі два экзэмпляры газэт. Комсамольская ячэйка не клапоціцца аб тым, каб організаваць культурнае абслугоўваньне колгасьнікаў. Радыё маўчыць. Ячэйка таксама маўчыць. Ніякай падрыхтоўчай работы да культ-абслугоўваньня ўборкі не разгорнута.

Тут няма ўтульнага прытулку

Культурна-масавая работа не знайшла сабе прытулку ні ў водным кутку Сакалішчанскага сельсавету (Расонскі раён). Праўда, ёсьць хата-чытальня, але які-ж толк з яе, калі яе заўжды вартуе замок. Ні ў аднэй вёсцы, ні ў адным колгасе няма чырвонага кутка. А комсамольцы Сакалішчанскай ячэйкі ўдзельнічаюць у вечарынках, на якіх „культурна“ вытанцоўваць, а культработы ня вядуць.

Опортуністычны вецер вее..

Опортуністычная недаацэнка культ-масавай работы пануе ў колгасе „Новы Сьвет“. Культсілы, якія ёсьць у колгасе, скарыстоўваюць дужа „рацыянальна“: некалькі разоў настаўніка прымушалі браць пугу і гнаць у поле пасьвіць кароў.

Будуюць...

Другі год будуюць хату чытальню ў колгасе „Асьвета“ (Любаньскі раён). Яе зрубілі яшчэ ў 1930 годзе. Недабудаваная яна самотна гніе пад адкрытым небам. А колгасьніку няма дзе выкарыстаць свой вольны час.

Яны трапілі на чорную дошку. Сюды ня трапіць ніхто з тых, хто пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, па-баявому разгортвае культмасавую работу ў колгасах, саўгасах, вёсках, хто па-ударнаму рыхтуецца да культабслугоўваньня ўборачнай.

Трапіўшым сюды мы гаворым: „Шлях да чырвонай дошкі адкрыт перад вамі. Ідзеце па ім!“.

Што павінен ведаць комсамолец у час „паходу за правільны ўлік працы ў колгасах“

II

Як запісваць працадні ў працоўную кніжку

Ўлік працы вядзе брыгадзір, які праастаўляе ў „найменным сьпісу“ выпрацоўку кожнага колгасьніка ў дзень і пасьля заканчэньня работы запісвае па нараду кольні кожнаму колгасьніку налічваецца працадзён за выкананую работу. Ня менш, чым раз у пяцідзёнку гэтыя працадні ён заносіць у працоўную кніжку колгасьніка.

У больш буйных брыгадах магчыма вылучыць у дапамогу брыгадзіру з складу брыгады спэцыяльную асобу — вучотчыка.

Кожная комсамольская ячэйка павінна імкнуцца гэтую працу ўсклясьці на больш пісьменных сваіх членаў. Задача вучотчыка — дапамагчы брыгадзіру зрабіць неабходныя вылічэньні, абмер тэрыторыі, якасьць працы і калі патрэбна занесьці працадні ў працоўную кніжку, а брыгадзір расьпісваецца.

Як запісаць працадні за мінулы час, калі ў колгасе ня было яшчэ зьдзельшчыны, норм? Гэтае пытаньне на практыцы трэба развязаць наступным чынам:

Перш за ўсё трэба ўстанавіць выпрацоўку кожнага колгасьніка па тых запісах, якія рабіў у свой час брыгадзір, ці кіраўнік галіны або рад колгасаў гэткія запісы меў.

Напрыклад, колгасьнік Сьвірко ў лютым месяцы капаў гной. Адзначана, што ён выкапаў 50 вазоў, пры ўстаноўленай у колгасе норме; 10 вазоў у дзень. Праца гэта адносіцца да цяжкай і ацэньваецца дзённая норма у 10 вазоў 1,25 працадня, альбо 12 сотых за адзін воз. Такім чынам, гэтаму колгасьніку за 50 вазоў трэба запісаць 6 працадзён.

У тых выпадках, калі ў колгасе няма ніякіх запісаў аб колькасьці выкананай за мінулы час работы і зельга таксама апро ам гэта ўстанавіць — прыдзецца запісаныя „палкі“ перавесьці ў працадні, беручы ў аснову, што колгасьнік у гэты дзень рабіў. Напрыклад, колгасьніца тры дні працавала на сартоўцы (колькі адсортавана збожжа — невядома); работа гэта сярэдняя. Такім чынам, за кожны дзень работы залічваецца адзін працадзень. Калі ў колгасе да гэтага часу запісваліся гадзіны і няма ніякай магчымасьці ўстанавіць колькасьці выпрацаваных дзён, дык гадзіны прыдзецца перавесьці ў рабочыя дні, прымаючы, прыкладна, адзін рабочы дзень за 10 гадзін у час вясеньняга севу і за 6-8 гадзін у зімовы пэрыод. Рабочыя дні вышэй адзначаным спосабам пераводзяцца потым у працадні.

Задача кожнага комсамольца: усімі сродкамі дабівацца абавязковага ўліку колькасьці і якасьці выкананай кожным колгасьнікам работы, змагаючыся рашуча з настроямі ўраўнілаўкі і прыхільнікамі падзёншчыны.

Не пакідаць колгасу, пакуль ня будуць падагулены вынікі

Пасьля таго, як будуць падлічаны працадні ўсім колгасьнікам, за ўвесь час з 1-га студзеня, альбо з часу організацыі колгасу (калі ён організаваўся ў 1931 годзе), вынікі неабходна яшчэ раз праверыць на паседжаньні праўленьня і вынесьці на зацьверджаньне агульнага сходу колгасьнікаў.

Кожны комсамолец, які ўдзельнічае ў паходзе, павінен цьвёрда памятаць, што ён адказвае за правільны ўлік працадзён і правільны запіс у працоўных кніжках у тым колгасе, да якога ён прымацаваны.

Не пакідаць колгасу да тэй пары, пакуль гэта адказьнейшая праца будзе поўнасьцю скончана.

Пасьпяховае правядзеньне гэтай адказнай працы да пачатку ўборачнай кампаніі гарантуе чоткае выкананьне колгасамі задач уборачнай кампаніі і стане магутным фактарам замацаваньня зьдзельшчыны ў колгасным будаўніцтве.

А. Баліцін.

Культ-масавая работа ў часе ўборкі

Разгортвайце зацейніцкі рух

Адным з відаў політасьветмасавай работы у часе уборкі зьяўляецца зацейніцтва. Гэта новы самадзейны рух вырас і атрымаў шырокае разьвіцьцё толькі у апошнія гады, ён расьце і пашыраецца пад лёзунгам барацьбы супроць бяскультур'я у нашым быту і працы, аб'ядноўваючы музыкаў, запявал, пляс ноў, сьпевакоў, ігракоў і г. д.

Асабліва вялізарную карысьць зацейніцкі рух можа прынесьці ў колгасах, наладзіўшы новыя, жывыя формы масавага адпачынку.

Зацейнік разглядае свой удзел у тым ці іншым выступленьні (спэктакаль, жывыя газэты, концэрт, гулянка і г. д.) як сродак агітацыі і пропаганды за новы быт, за новую вёску, за колгас. У сваіх выступленьнях ён перш за ўсё адлюстроўвае мясцовыя хвалюючыя пытаньні.

Імкнучыся як мага шырэй разгарнуць сваю дзейнасьць, зацейнік вядзе сваю актыўную работу ня толькі у колгасе, а ідзе на поле, дзе адбываецца уборка ураджаю, у суседнюю вёску, на вуліцы, пасідзелкі альбо вечарынку.

Галоўны сакрэт зацейніка у тым, што ён можа прымусіць прысутных праявіць сваю самадзейнасьць, запаліць іх. Першапачатковым аб'яднаньнем зацейнікаў зьяўляецца звычайна ядро, прыкладна 5—10 чал. Такія ядры організуюцца пры культурна-бытавой камісіі. Яны павінны увязваць сваю работу і іншымі мастацкімі гурткамі.

Аб іншых відах і формах культполітасьветнай работы у часе уборкі — у наступны раз.

Р. Дзянісаў.

Напярэдадні кантрольнага пленуму

БІЦЦА ЗА КОМСАМОЛЬСКУЮ ЯЧЭЙКУ Ў КОЖНЫМ КОЛГАСЕ

Організацыя колгасных ячэек—слабое зьвяно барацьбы за шматмільённы комсамол

Матар'ялы з Гарадоцкага р-ну сьведчаць аб махровейшай опортуністычнай недаацэнцы кіраўніцтвам РК ЛКСМБ важнасьці пераўтварэньня комсамолу ў шматмільённую організацыю.

Зусім адваротнае мы бачым у Вульскім раёне. Там рашэньні комсамольскіх зьездаў былі адразу пераведзены на мову конкрэтных спраў.

Але ня гледзячы на некаторыя зрухі ў росьце комсамольскай організацыі на вёсцы, ацэнка ЦК УсеКП(б) аб тым, што організацыя колгасных ячэек праходзіць зусім слаба, застаецца ў сіле, таму падрыхтоўка да кантрольнага пленуму і сам пленум павінен зрабіць рашучы пералом у бок неадкладнага ажыцьцяўленьня рашэньняў комсамольскіх зьездаў аб росьце саюзу.

Трэба неадкладна правесьці перападрыхтоўку на каротка-тэрміновых курсах усіх сакратароў комсамольскіх ячэек у колгасах, вылучэньне і падрыхтоўку 600 організатараў новых колгасных комсамольскіх ячэек.

Стаўка на самацёк павінна быць біта

З часу комсамольскіх зьездаў Любанская комсамольская організацыя вырасла на 81 чалавек. Організаваны 4 новыя колгасныя ячэйкі. У бліжэйшыя дні будуць організаваны яшчэ 4 ячэйкі пры колгасах.

Гэтыя паказчыкі маглі-б быць яшчэ большымі, калі-б РК комсамолу і большасьць комсамольскіх ячэек сур'ёзна займаліся пытаньнем росту, а ня бралі стаўку на самацёк.

Так, напрыклад, Рэдкаўская комсамольская ячэйка за 6 месяцаў вырасла толькі на аднаго чалавека. За гэты-ж тэрмін на такую-ж колькасьць вырасьлі і Арэхская, Вяліка-Гарадзішчанская, Рачэнская, Мала-Гарадзішчанская і Згодўская ячэйкі.

І гэта ў той час, калі ў межах дзеяньня гэтых ячэек знаходзіцца каля 10 колгасаў.

На сёньня пры 22 колгасах зусім няма комсамольскіх ячэек.

Бываюць выпадкі, што ячэйкі трымаюць анкеты новапаступаючых комсамольцаў па некалькі месяцаў, а райком затрымлівае іх больш.

Зараз раённы камітэт комсамолу разгарнуў шырокую работу па росту. Па комсамольскай лініі: праводзяцца зьлёты колгаснае моладзі, гутаркі на полі і г. д.

Я. Барановскі

Ліквідаваць адставаньне

Бюро Жыткавіцкага райкому комсамолу на сваім кантрольным паседжаньні констатавала яўна нездавальняючыя тэмпы работы па росту. З 1-га студзеня па 1-е мая організацыя вырасла толькі на 79 чалавек.

І толькі з чэрвеня ячэйкі па-баявому ўзяліся за рост. За 15 дзён чэрвеня ў комсамол прынята 65 чалавек, з якіх 43 чалавекі колгаснае моладзі. Зусім дрэнна ідзе рост у Бранілаўскай, Чарняўскай ячэйках і ячэйцы заводу „Праца".

З часу Х-га зьезду ЛКСМБ у раёне організаваны 6 новых колгасных ячэек і ў час падрыхтоўкі да пленуму яшчэ 4.

Разгорнута работа па справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро ячэек дае новы прыліў у комсамол. Па няпоўных даных, у трох ячэйках прынята 10 чалавек.

Брагінскі, Карзо

Рост зусім недастатковы

Заслаўская комсамольская організацыя слаба ў конкрэтна рашэньні IX-га зьезду УсеЛКСМ па росту. Райком комсамолу, выпрацаваўшы пры сваю рэзолюцыю па гэтаму пытаньню, не давёў яе да кожнай ячэйкі, к масам моладзі колгасьнікаў.

Па саўгасах і колгасах не практыкавалася правядзеньне маладзёжных сходаў па пытаньню ўцягненьня моладзі ў комсамол.

За 3 поў. месяцы (красавік, май і палова чэрвеня) у комсамол прынята толькі 61 чалавек, з іх у красавіку—11 чалавек, у маі—12 і ў чэрвені—27.

Большасьць комсамольскіх ячэек не займалася пытаньнем росту. Ячэйка Анусінскага сельсавету, на тэрыторыі якога 3 буйныя колгасы, за тры месяцы вырасла на тры чалавекі. Ды і то заявы прынятых таварышоў марынаваліся тры месяцы.

Дрэнна з ростам і ў МТС. З 107 чалавек моладзі комсамольская ячэйка ўзрост, у комсамольскай ячэйцы толькі 29 чалавек. З трактарыстаў ніякай працы не праводзіцца. У брыгадах часьцякова няма комсамольцаў.

Райком комсамолу ні разу не заслухаў справаздачы колгаснай і саўгаснай ячэйкі аб рабоце па росту. Дрэнна выканана дырэктыва IX-га зьезду комсамолу аб організацыі ў кожным колгасе комсамольскай ячэйкі. На 3 колгасаў толькі 15 колгасных ячэек.

Райком комсамолу павінен зрабіць рашучы зрух у галіне росту.

Прыбыт к Янка.

БРЫГАДЫ ДРУКУ—У ПЕРШЫЯ РАДЫ ЗМАГАРОЎ ЗА КОЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ

ДНІ, ШТО ЗАСТАЛІСЯ ДА ЗЬЕЗДУ, СКАРЫСТАЦЬ ПА-ЎДАРНАМУ

Юнкоры „ЧЗ"—актыўныя барацьбіты за выкананьне пяцігодкі

(Старобінскі раён)

Юнкораўская брыгада „ЧЗ" мястэчка Пагост зараз-жа пасьля сваёй організацыі актыўна ўзялася за выкананьне сваіх абавязкаў.

Да месячніка друку мы прыходзім са значнымі дасягненьнямі. Брыгада актыўна змагаецца праз насьценгазэту за колектывізацыю, за ліквідацыю кулацтва як класы. Дзякуючы актыўнай працы юнкорбрыгады 15 аднаасобнікаў уступілі ў колгас. Організаваны новы колгас у вёсцы Залессьсе, Пагоскага сельсавету.

Брыгада таксама актыўна ўдзельнічае ў мобілізацыі сродкаў, завербавана некалькі новых укладчыкаў у ашчакасу; актыўна ўдзельнічае ў распаўсюджваньні друку, на апошні момант завербавана 213 падпісчыкаў на газэту і распаўсюджана сельскагаспадарчай літаратуры на 13 руб.

Юнкоры распаўсюджваюць пазыку „Асоавіяхіму".

Брыгада ўзяла на сябе абавязак у месячнік друку організаваць насьценгазэту ў колгасе „Зьвязда". Гэты абавязак ужо выконваецца. Абяцаем, што насьценгазэту колгасу „Зьвязда" ператворым у сапраўднага барацьбіта за дзелавітасьць колгасу, за ўкараненьне і ўмацаваньне зьдзельшчыны ў ім, за ліквідацыю абязьлічкі, за ўдарныя тэмпы правядзеньня ўборачнай кампаніі.

Усю сваю працу праводзім у соцспаборніцтве і ўдарніцтве. Абяцаем, што на гэтых дасягненьнях мы ня спынімся. Пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і комсамолу будзем ісьці і надалей на новыя дасягненьні.

Кіраўнік юнкорбрыгады „ЧЗ" Малочка.

Хто прабудзіць?

Рабселькораўскі рух у Бабчынскім, Рудакоўскім, Старалічаўскім, Палікім сельсаветах (Хойніцкага раёну)—у стане беспрытульнасьці. Селькоры гэтых сельсаветаў працуюць без рулю і ветразяў. Партыйныя і комсамольскія ячэйкі гэтым ня цікавяцца. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху яшчэ ня праводзіцца. Перавыбары рэдколегіяў не праведзены, а старыя не працуюць. Насьценгазэты ў колгасах „Кастрычнік", „Сталіна", „Комсамолец" і саўгасе Рудакова па два месяцы не выходзяць. У колгасах „Леніна", „Кооператар", „Чырвоны партызан" да месячніка друку насьценгазэты яшчэ не організаваны.

У справе правядзеньня месячніка друку партыйна-комсамольскія ячэйкі абмяжоўваюцца толькі абяцанкамі, а конкрэтна нічога не робяць.

А. Лаўчэнка.

Падрыхтоўка на паперы

Месячнік друку ў Пятрыкоўскім раёне праходзіць марудным тэмпам. Пляны правядзеньня месячніка друку да гэтага часу засталіся на паперы.

Комсамольская організацыя не вядзе сярод моладзі ніякай падрыхтоўчай працы да зьезду. Некаторыя адказныя працаўнікі РК ЛКСМБ думаюць, што ўсю працу павінны выконваць толькі юнкоры і рабкоры. Але юнкоры працуюць у адасобку, ня маючы сталага кіраўніцтва.

Ячэйкі КП(б)Б таксама ня прымаюць ніякіх захадаў да правядзеньня месячніка друку і падрыхтоўкі да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Пост „ЧЗ" Пінчук.

Паведамленьне

24-га чэрвеня 1931 г., а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Менгаркому ЛКСМБ склікаецца нарада сакратароў колектываў ФЗВ па пытаньню падрыхтоўкі да конфэрэнцыі фабзаўвучнікаў.

На нараду павінны зьявіцца наступныя сакратары:

ФЗВ—заводу „Ударнік", МШВ—Будвучу Белзавбудаб'яднаньня, Будвучу Белжылсаюзу, Будвучу Менбудаб'яднаньня, ФЗВ Кулінараў, ФЗВ хлебапячэньня, ФЗВ імя КІМ'у, Друкарні імя Сталіна, ФЗВ заводу „Бальшавік".

Культпроп Менгаркому ЛКСМБ.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ

ШТАБ КІРАЎНІЦТВА ПАВЕДАМЛЯЕ:

24-га чэрвеня, а 7-й гадзіне ўвечары, ў памяшканьні рэд. „Чырв. Зьмены"

АДБУДЗЕЦЦА

тэрміновае паседжаньне

штабу кіраўніцтва разгортваньнем рэалізацыі пазыкі „Трэцяга рашаючага".

На паседжаньне выклікаюцца т. т. Вансоўскі (ЦВК), Абрамсон (НКФ), Захарава (кір. ашчадкас), прадстаўнікі Колгасцэнтру, ЦСПСБ, заводаў імя Варашылава, „Бальшавік" і „Кастрычнік"

Запрашаюцца юнкоры „Чырвонай Зьмены" менскіх прадпрыемстваў. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

Штаб кіраўніцтва „Ч. З."

Два райкомы—два паказчыкі: абломаўскіх і ўдарных тэмпаў

(Ад нашага спэцкора)

„УсеЛКСМ павінен значна ўзмацніць уцягненьне ў комсамол перадавой колгаснай моладзі. Дабіцца ў бліжэйшае паўгодзьдзе стварэньня ячэек пры кожным саўгасе, колгасе". Гэтая пастанова IX-га зьезду комсамолу ні ў якай меры ня выканана ў Гарадоцкай комсамольскай організацыі.

Аб чым гавораць лічбы і факты

У раёне 275 колгасаў, а комсамольскіх ячэек толькі 32 Большасьць з гэтых ячэек фактычна знаходзяцца не пры колгасах, а пры сельсаветах. За 5 месяцаў організаваны толькі 3 комсамольскія ячэйкі. Такія „тэмпы" ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьня пастановы зьезду.

Ня гледзячы на тое, што ў раёне вялікія об'екты для росту (275 колгасаў, 4 саўгас, некалькі дробных заводаў, вялікая саматужная прамысловасьць у горадзе), комсамольская організацыя налічвае толькі 600 чал.

Рост комсамольскіх ячэек зусім нязначны. За першы квартал у комсамол прынята 99 чал., за красавік-май—77 чал. Гэты рост даюць толькі ячэйкі комуны Леніна (20 чал.), „Чырвоны Пуцілавец" (15 чал.) Руднянская ячэйка (10 чал.) і ячэйкі толькі што організаваныя.

На прадпрыемствах і ў колгасах вельмі нязначная комсамольская праслойка. Вось прыклады: у Саладухінскім сельсавеце—7 комсамольцаў, Хвашнянскім—9, Горкаўскі—8, Асіпаўскім—8, Пылькінскім—9, і Маскалянецкім—9 комсамольцаў. Такое самае становішча і ў радзе іншых сельсаветаў (Мехаўскі, Кузьмінаўскі, Халамерскі). У гэтых сельсаветах па 8—10 колгасаў і толькі па аднэй комсамольскай ячэйцы. Комсамольцы, адзінкамі рассіданы па колгасах.

У Руднянскім сельсавеце суцэльнай колектывізацыі на 11 колгасаў толькі 2 ячэйкі з 25 комсамольцамі. У Аляксандраўскім сельсавеце, дзе больш 15 колгасаў, адна ячэйка з 14 комсамольцамі.

У саўгасе „Загарані" больш 100 чал. рабочай моладзі, а ў комсамоле толькі 7 чал.

Стаўкай на самацёк правалілі рост

Галоўная прычына дрэннага росту комсамольскай організацыі Гарадоцкага раёну ў тым, што райком не працаваў над выкананьнем рашэньняў комсамольскіх зьездаў. Як апошнія пастановы ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ, так і наогул пытаньні росту ня былі прадметам абгаварэньня на бюро райкому, пленумаў і ўсёй комсамольскай організацыі. У гэтым напрамку не праводзілася абсолютна ніякай работы. Опортуністычны самацёк, бязьдзейнасьць—яскравая ілюстрацыя работы організацыі.

З 34 сэкратароў вясковых ячэек, каля 15—настаўнікі, якія працуюць у ячэйках „пастолькі-паколькі", калі ёсьць час.

Ніякай масавай работы з колгаснай моладзьдзю не праводзіцца. Хаты-чытальні ў большасьці на замку.

Дагэтуль яшчэ не організавана пры райкоме прыймовая камісія, анкеты разьбіраюцца бяз выклікаў уступаючых у комсамол,—адразу на бюро райкому.

У чым сакрэт перамогі ў Вульшчыне

Ня ў прыклад Гарадоччыне Вульскі раён. Тут задачу росту комсамольская організацыя ставіць першачарговым пытаньнем. Адгэтуль і вынікі нядрэнныя.

Чацьвертая частка больш буйных колгасаў мае комсамольскія ячэйкі. У сярэдвім па дзьве на сельсавет. З часу апошняй раённай конфэрэнцыі пры колгасах організаваны 6 новых ячэек і прыняты ў комсамол 264 комсамольцы, з якіх 72 проц. колгасьнікаў.

Усе комсамольцы зараз у колгасах, і ячэйкі існуюць выключна пры колгасах.

Райком узяў пад свой асобны нагляд рост у ячэйках торпзаводу, колгасаў „Марс", „Бальшавік", „Комунар". Да гэтых ячэек прымацаваны члены бюро райкому.

За апошнія месяцы некаторыя ячэйкі падвоілі і патроілі свой склад. Так, напрыклад, ячэйка колгасу „Марс" з 9 чалавек вырасла да 29 чал. колгасу „Комунар"—з 15 да 30 чал., організаваўшы дзьве новыя ячэйкі у колгасах „Комінтэрн" і „Пролетары". Ячэйка колгасу „Сіла", работа якое была заняпаўшы, разгарнуўшы зараз масавую работу, вырасла на 20 чал. Вобальская ШКМ (склад пераважна батрацка-бядняцкі) поўнасьцю акомсамолілася.

Комсамольскія ячэйкі ўцягваюць колгасную і беспартыйную моладзь у політгурткі, організуюць масавую работу (на агульным сходзе беспартыйнай моладзі колгасу „Комунар" пададзена 12 заяў у комсамол), сваёй ударнай прыкладнай работай на колгасных палёх уцягваюць беспартыйную рабочую і колгасную моладзь у комсамол.

Праўда, ня ўсё яшчэ зроблена ў Вульскім раёне. У радзе ячэек (колгас „Новы шлях", „Бязбожнік") яшчэ слабы рост. Яшчэ нездавальняюча праходзіць рост за лік рабочай моладзі на торпазаводзе, дзе 300 чалавек моладзі, а комсамольская ячэйка вырасла толькі на 30 чалавек.

***

Вульскі раён—у два разы меншы Гарадоцкага і ў тры разы там менш колгасаў.

А комсамольская організацыя налічвае 700 чал. На сто комсамольцаў больш, чым у Гарадоцкім раёне, дзе ў сярэднім на ячэйку як гораду, так і вёскі прыпадае па 15 комсамольцаў.

Опортуністыя з Гарадоцкага Райкамолу, якія недаацанілі політычнай сутнасьці росту, ня выканалі пастановы партыі і комсамолу, павінны трымаць адказ.

Гарадоцкая організацыя павінна выправіць сваю памылку і ў час перавыбараў бюро яч. ліквідаваць прарыў, каб да кантрольнага пленуму прыйсьці з падвойным, з патроеным складам сваіх радоў.

А. Усьмінскі.

Усім сакратарам комсамольскіх колектываў і старэйшым брыгадзірам юнкорбрыгад

25 чэрвеня 1931 г., пасьля працы, а 4 з паловай гадзіны ўвечары па ўсіх прадпрыемствах і навучальных установах праводзяцца зьлёты юнкораў, насьценкораў-ударнікаў, сумесна з комсамольскай і беспартыйнай моладзьдзю, па наступных пытаньнях:

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну прадпрыемства;

2. Папярэднія вынікі месячніка друку і правядзеньня падрыхтоўчай працы да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

3. Конкрэтныя задачы юнкораў данага прадпрыемства.

Парадак вядзеньня зьлёту: даклад гаспадарніка аб выкананьні прамфінпляну, інформацыя аб папярэдніх выніках правядзеньня месячніка друку, падрыхтоўчай працы на прадпрыемстве і ўдзел юнкораў у выкананьні прамфінпляну данага прадпрыемства.

Адказнасьць за правядзеньне зьлёту ўскладаецца на сакратароў комсамольскіх колектываў, комсамольцаў, якія працуюць у рэдколегіях, старэйшага брыгадзіра юнкор-брыгад.

Менгарком комсамолу
Рэдакцыя „Чырв. Зьмены"

Друкарня імя тав. Сталіна.
Галоўлітбел № 599